**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ**
**ЯКУБА КОЛАСА**

# Інфармацыйнае паведамленне

***3 лістапада 2026 года***
**запрашаем Вас прыняць удзел у**
**XL навуковай канферэнцыі «Каласавіны»**

Юбілейная XL навуковая канферэнцыя «Каласавіны» робіць адсыл да гісторыі ўзнікнення, станаўлення і развіцця навуковага коласазнаўства, да захавання фундаментальнасці і непазбежнай абумоўленай рознымі фактарамі трансфармацыі на мяжы XX і XXI стагоддзяў; плануе стаць чарговым падсумаваннем пройдзеных этапаў і вызначэннем далейшых шляхоў і напрамкаў дзейнасці.

Да ўдзелу запрашаюцца спецыялісты ў галіне навуковага коласазнаўства, гісторыі беларускай літаратуры XIX–XX стст., гісторыкі, архівісты, журналісты, культуролагі, спецыялісты музейнай справы.

<u>Праблематыка канферэнцыі</u>:

1. Творчасць Якуба Коласа ў літаратурным, духоўным і сацыякультурным кантэксце XX – пачатку XXI стагоддзя: кантакты, паралелі, палеміка, узаемадзеянні і ўплывы.
2. Коласазнаўства ў XXI ст.: вынікі і перспектывы.
3. Якуб Колас і сучаснасць: новыя аспекты рэцэпцыі творчасці.
4. Творчасць Якуба Коласа ў кантэксце беларускай і сусветнай літаратур.
5. Літаратуразнаўчыя, культуралагічныя, лінгвістычныя падыходы да асэнсавання твораў Якуба Коласа.
6. Якуб Колас — педагог. Да 100-годдзя выхаду «Методыкі роднае мовы».
7. Узаемадзеянне музеяў і ўстаноў культуры і адукацыі.
8. Літаратурна-мемарыяльны музей: адметнасць, магчымасці, праблемы, перспектывы.

Да абмеркавання прымаюцца тэмы ў рэчышчы акрэсленай праблематыкі і іншыя, сугучныя згаданым.

Узнятыя праблемы будуць разгледжаны ў фармаце пленарнага і секцыйных пасяджэнняў.

**Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору выступленняў і матэрыялаў для публікацыі, а таксама іх рэдагавання.**

Рабочыя мовы канферэнцыі — беларуская, руская, іншыя славянскія.

Па выніках працы канферэнцыі будзе выдадзены зборнік матэрыялаў «Каласавіны».

**Увага!** Навуковыя паведамленні прымаюцца да друку толькі пры ўмове непасрэднага ўдзелу ў канферэнцыі.

Для ўдзелу ў канферэнцыі неабходна не пазней **14 кастрычніка 2026 г.** падаць заяўку (форма заяўкі дадаецца) на электронны адрас info@kolasmuseum.by ці іншым зручным спосабам.

***Праезд і пражыванне – за кошт удзельнікаў канферэнцыі.***

**Месца правядзення**: **Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа**
**Адрас музея: 220012, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5**
**Каардынатар канферэнцыі – вучоны сакратар Казловіч Ірына Міхайлаўна**
**+375 17 270 19 40**
**e-mail: info@kolasmuseum.by**
**http://kolasmuseum.by/**

Аргкамітэт

Дадатак

**Заяўка на ўдзел у XL навуковай канферэнцыі «Каласавіны»**

**1. Прозвішча, імя, імя па бацьку**______________________________________

**2. Месца працы (вучобы), пасада**_____________________________________

**3. Вучоная ступень, званне**___________________________________________

**4. Працоўны адрас, тэлефон, e-mail (абавязкова!)** ______________________
_________________________________________________________________

**5. Тэма даклада, яго аб'ём**____________________________________________

**6. Неабходнасць арганізацыі пражывання**________________________________

**7. Тэхнічныя сродкі для прэзентацыі**___________________________________

Усе палі абавязковыя да запаўнення.

**Патрабаванні да афармлення матэрыялаў:**

Аб'ём – **<u>да 6 старонак</u>** у рэдактары WORD (RTF), набраных праз **1,15** інтэрвала шрыфтам **Times New Roman 14 ПТ**, усе палі – **20 мм**, абзац – **10 мм.** Першы радок – імя і прозвішча аўтара тлустым шрыфтам, праз радок – назва даклада тлустым шрыфтам па цэнтры. Праз радок – тэкст даклада. Праз радок пасля асноўнага тэксту – спіс выкарыстанай літаратуры (**Літаратура** па цэнтры тлустым, пазіцыі – нумераваны спіс, шрыфт **12 ПТ**). Спасылкі ў тэксце падаюцца ў квадратных дужках. Цытаты з мастацкіх твораў выдзялаюцца **курсівам**, двукоссе абазначаецца як « ». Радкі вершаваных твораў аддзяляюцца дзвюма //.

Перакананўча просім прытрымлівацца патрабаванняў.